Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мінчука асудзілі да 10 гадоў калоніі за падпал танка, які Мінабароны назвала фэйкам

26.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед

Сёння, 26 ліпеня, у судзе Фрунзенскага раёна Мінска агучылі прысуд па крымінальнай справе па ч. 1 арт. 289 Крымінальнага кодэкса (акт тэрарызму) супраць 26-гадовага мінчука Ягора Міхайлава. Яго абвінавацілі ў падпале танка Т-72 на чыгуначнай станцыі ў Сцяпянцы шляхам кідка ў яго «кактэйля Молатава» з надпісам «ОГСБ» уначы 31 студзеня. Відэа палаючага танка з'явілася ў інтэрнэце ў пачатку лютага, але дзяржСМІ назвалі яго фэйкам, а Мінабароны прадэманстравала непашкоджаны і цэлы танк. Па версіі абвінавачвання, у выніку дзеянняў Міхайлава ўзнікла *"аб'ектыўная небяспека гібелі людзей"*, хаця патрулюючыя вайскоўцы ў ноч падпалу нават не заўважылі ўзгарання. Некаторыя дазналіся пра інцындэнт з інтэрнэту. У выніку, суддзя Алена Бушава прызначыла менавіта такое пакаранне, якое прасіў памочнік пракурора Фрунзенскага раёна Дзмітрый Хаваўка — дзесяць год калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Абвінавачаны слухаў прысуд у закаваных кайданкамі за спіной рукамі. На гэтым пераслед Міхайлава не скончаны: супраць яго распачатая яшчэ крымінальная справа.



Пылаючы танк у Сцяпянцы ў ноч з 30 на 31 студзеня

Нагадаем, Ягор Міхайлаў абвінавачваўся па ч. 1 арт. 289 Крымінальнага кодэкса (акт тэрарызму). Паводле версіі абвінавачвання, Міхайлаў "*наўмысна ў мэтах аказання ўздзеяння на прыняцце рашэнняў органамі ўлады, перашкоджання палітычнай дзейнасці, застрашвання насельніцтва, дэстабілізацыя грамадскага парадку, у перыяд часу з 3 гадзін 30 хвілін па 3 гадзін 36 хвілін 31 студзеня здзейсніў акт тэрарызму агульнанебяспечным спосабам шляхам падпалу ваеннай тэхнікі, якая належыць 120-й дывізіі, размешчаны на шляхах у эшалоне ў Сцяпянцы ў выніку чаго ўзнікла аб'ектыўная небяспека гібелі людзей, прычынення ім цялесных пашкоджанняў або наступлення іншых цяжкіх наступстваў*".

Амаль усё абвінавачванне пабудавана на відэа, якое апублікавалі 1 лютага ў телеграм-канале "Баста!". Міхайлаў мусіць выплаціць судовыя выдаткі ў суме 685 рублёў, матэрыяльнай кампенсацыі па справе заяўлена не было.

Міхайлаў прызнаў віну часткова: ён прызнаў, што здзейсніў падпал танка, але не пагадзіўся з кваліфікацыяй свайго дзеяння і тым, што гэта было зроблена з палітычных матываў.



У апошнім слове 19 ліпеня Ягор Міхайлаў яшчэ раз падкрэсліў нязгоду з прававой кваліфікацыяй сваіх дзеянняў:

> *"Шмат хацеў сказаць, але мяне дзёрнулі з бальнічнага, але давайце пройдземся спачатку па абвінавачванні. Пракурор кажа, калі там быў хоць адзін чалавек, то гэта ўжо падставы для прымянення артыкула [289]. Але нікога там не знаходзілася ў той момант, таму што ніякай аховы ваеннай тэхнікі не было: ні ў момант узгарання танка, ні пасля. Як сказаў мой адвакат пры праверцы паказанняў на месцы, контрразведчык шукаў вайскоўцаў 20 хвілін! Гэта разведчык! Іншы б наогул не знайшоў. Таксама пракурор уводзіць у зман, калі кажа, што да станцыі [ж/д] 70 метраў. Але потым адвакату кажа, што дадзенае відэа нічога не значыць, таму што яно зроблена ў 400 метрах ад танка. З нагоды самога пракурора: ні аднаго пытання, якое б не наводзіла на адказ, запалоханым сведкам вайскоўцам ён не называў. Абсалютна ўсе пытанні былі навадныя. А гэта забаронена.*
>
> *Ну і што было з танкам? Не што магло бы быць, а што было. Калі я пачаў чытаць паказанні сведак, то там слова "бы" — у кожным сказе па тры штукі. Яны хлусілі контрразведцы, каб прыкрыць, што там іх не было. Ну, бывае".*

Падрабязнасці па суду:



Па справе за падпал танка, які, па версіі Мінабароны, не пацярпеў, мінчуку запрасілі 10 гадоў калоніі

З 8 ліпеня ў судзе Фрунзенскага раёна Мінска разглядаецца крымінальная справа па ч. 1 арт. 289 Крымінальнага кодэкса (акт тэрарызму) супраць 26-гадовага мінчука Ягора Міхайлава.



Мінабароны назвала відэа з пылаючым танкам у Сцяпянцы фэйкам, але цяпер за яго падпал як за акт тэрарызму судзяць мінчука

Справу разглядае суддзя Алена Бушава, дзяржабвінавачанне падтрымлівае памочнік пракурора Фрунзенскага раёна Дзмітрый Хаваўка.

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

